**Выбар прафесіі – адно з найважнейшых рашэнняў, якое чалавек прымае ў жыцці. Выдатна, калі работа адпавядае інтарэсам і магчымасцям, прыносіць радасць і добра аплачваецца. Якім вы бачыце сябе ў прафесіі гадоў праз... дваццаць? З такім пытаннем карэспандэнт «МГ» звярнулася да навучэнцаў Маладзечанскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа.**

**Лія КЛЮЧНІК:**



— У Маладзечна прыехала з Вілейкі. Па заканчэнні каледжа буду працаваць тэхнікам-тэхнолагам. Вельмі люблю выпякаць тарты, пірожныя, бісквіты. Мару ўзначаліць прыватную кандытарскую ці ўтульнае кафэ, дзе заўсёды будзе водар свежай выпечкі і шмат наведвальнікаў.

**Андрэй КАЖАМЯКІН:**



— Выбраў прафесію механіка. Наперадзе апошні навучальны год. Практыку прайшоў пасля пяхова. У маіх будучых абавязках — наладка і абслугоўванне харчовага абсталявання. Праз два дзесяцігоддзі бачу сябе на пасадзе галоўнага механіка аднаго з вядучых прадпрыемстваў галіны.

**Ірына ПІШЧАКА:**



— Пра далёкую перспектыву яшчэ не задумвалася. Пакуль для мяне галоўнае – навучыцца працаваць з цестам, выпякаць хлеб, караваі, пірагі, рулеты, пірожныя, афармляць тарты. Імкнуся стаць сапраўдным прафесіяналам сваёй справы.

**Аляксандр СМЫШЛЯЕЎ:**



— У каледжы вучуся па спецыяльнасці «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва». Хачу авалодаць прафесіяй, каб потым прымяняць свае веды на практыцы. Разумею важнасць кар'еры. Поспех на рабоце адкрывае новыя магчымасці, дае матэрыяльную стабільнасць, павагу калег. Праз дваццаць гадоў бачу сябе запатрабаваным спецыялістам.

**Уладзіслаў ГЕРАСІМ:**



— Мая вучоба ў політэхнічным каледжы толькі пачынаецца. Лічу, што ў далейшым змагу дасягнуць пастаўленай мэты – рэалізаваць сябе на вытворчасці. Першы крок у прафесію зроблены. А далей час пакажа.

**Людміла ЦАР.**
**Фота: Аляксей ПЛАТКО.**